# КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ: НЕВЯДОМАЕ Ў ВЯДОМЫМ

# CULTUROLOGICAL THOUGHT IN BELARUS: THE UNKNOWN IN THE WELL-KNOWN

***С.В. Снапкоўская***

***S. V. Snapkouskaya***

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Мінск, Беларусь
Belarusian State University
Minsk, Belarus
*E-mail: ssvet88@inbox.ru*

Сучасная ідэалогія беларускай дзяржавы прадугледжвае распрацоўку трывалай гісторыка-культурнай асновы жыццядзейнасці сучаснага соцыуму. Гэта выклікае неабходнасць распрацоўкі культуралагічнага абгрунтавання фарміравання сістэмы маральных каштоўнасцей у культуры Беларусі. Кожная гістарычная фармацыя характарызуецца наборам і іерархіяй спецыфічных каштоўнасцей, сістэма якіх выступае ў якасці найбольш высокага ўзроўню сацыяльнай рэгуляцыі. Каштоўнасныя сістэмы фарміруюцца і трансфармуюцца ў працэсе гістарычнага развіцця грамадства.

Паколькі каштоўнасці існуюць толькі ў адносінах да чалавека, то ў дадзеным падыходзе аксіялагічныя феномены суадносяцца з патрэбамі і інтарэсамі асобы. Аксіялагічны аналіз культуры служыць неабходнай перадумовай параўнальна-культурных даследаванняў. Яны ўключаюць параўнанне гістарычных традыцый у плане падабенства і адрознення сістэм каштоўнасцей, супастаўленне паміж стадыямі аксіялагічнай свядомасці грамадства і індывіда.

У красавіку 2017 года ў выдавецтве РІВШ БДУ выйшаў вучэбны дапаможнік "Культуралагічная думка Беларусі", падрыхтаваны С.В. Снапкоўскай і К.У. Антановічам. Ствараючы кнігу, аўтары наўмысна адышлі ад традыцыйных падыходаў. У вучэбным дапаможніку за аснову ўзяты аксіялагічны падыход, звязаны з вывучэннем культуры як сукупнасці каштоўнасцей. Аксіялагічны падыход імкнецца да плюралізму і да выяўлення спектру каштоўнасцей у аснове чалавечых учынкаў, гісторыі і культуры. Пры гэтым аксіялогія даследуе каштоўнасці ў разнастайных аспектах як прадмет рэалізацыі і як ацэнку.

Аўтарамі дапаможніка выкарыстаны таксама і культуралагічны падыход, які дазваляе зрабіць акцэнт не столькі на нкрэтных фактах значнасці асобных каштоўнасцей, колькі на аналізе, асэнсаванні, ацэнцы і высвятленні ролі каштоўнасцей у жыцці народа, яго самаідэнтыфікацыі, фарміраванні грамадствам самасвядомасці на аснове агульначалавечых і маральных каштоўнасцей і ідэалаў. Выкарыстанне параўнальна-гістарычнага падыходу прадугледжвае грунтоўнае вывучэнне паходжання і фарміравання нацыянальнай культуры, тых ці іншых культурных з'яў у межах як аднаго этнасу, так і іх сукупнасці. Пры гэтым першапачаткова праводзіцца параўнальна-тыпалагічнае даследаванне асобных кампанентаў культуры этнасу, а таксама падобных кампанентаў у іншых роднасных культурах. У сучаснай заходняй культуралогіі параўнальна-гістарычны метад выкарыстоўваецца як метад культурнай тыпалогіі, які адмаўляе адзіныя заканамернасці гістарычнага развіцця і вылучае галоўным чынам не агульныя, а адметныя рысы ў культурах народаў свету. Дадзены метад дазваляе пашырыць магчымасці аксіялагічнага аналізу праблемы, вылучыць адметныя характарыстыкі маральных і нацыянальных каштоўнасцей, папулярызацыя якіх адбывалася ў беларускай культуры адзначанага перыяду, больш глыбока асэнсаваць мастацкія тэксты. Гэты метад дае магчымасць раскрыць асаблівасціынамікі фарміравання каштоўнасных арыенціраў у грамадстве напярэдадні і падчас нацыянальнага адраджэння, правесці паралелі з аналагічнымі працэсамі ў замежнай культуралагічнай думцы. Хcraналагічны змест кнігі звязаны з перыядам XIX - пачатку XX стст., калі склалася цэласная сістэма гуманістычнага і этычнага светапогляду ў культуры Беларусі. Яна ўключала ў сябе характэрныя маральныя імператывы, якія знайшлі адлюстраванне ў мастацкай літаратуры, літаратурнай крытыцы і публіцыстыцы. У пачатку XX ст. сістэма гуманістычнага і этычнага светапогляду стала асноватворным кампанентам працэсу самаідэнтыфікацыі беларускага народа.

Сінтэз маральных і нацыянальных каштоўнасцей выступаў у працах айчынных гісторыкаў, пісьменнікаў, публіцыстаў, асветнікаў і педагогаў у якасці дамінанты ў працэсе трансфармацыі соцыуму, арыентаванага на каштоўнасці сусветнай цывілізацыі. Перыяд XIX-пачатку XX стст. у культуралагічнай думцы характарызуецца паступовым імкненнем да зацвярджэння самакаштоўнасці індывіда і спробы стварэння ўніверсальных маральных прынцыпаў, якія мусілі быць заснаваны на багатай культурна-гістарычнай спадчыне. Маральнасць разумелася дзеячамі культуры як адзін са спосабаў

нарматыўнага рэгулявання паводзін чалавека, адмысловай формай грамадскай свядомасці і відам грамадскіх адносін.

Змест вучэбнага дапаможніка адпавядае задачам Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2016-2020 гг. Зыходзячы з Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 180 ад 8 сакавіка 2016 г., стратэгічнай мэтай праграмы з'яўляецца развіццё і эфектыўнае выкарыстанне культурнага патэнцыялу краіны, падтрымка культурных інавацый, захаванне і развіццё матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны.

У дадзеным рэчышчы аўтары падручніка прапануюць вырашыць комплекс навуковых, асветніцкіх і вучэбна-метадычных задач:

- паглыбіць веды чытачоў па асноўных пытаннях тэорыі і гісторыі культуры Беларусі; - тэарэтычна абгрунтаваць і раскрыць асноўныя дэтэрмінанты беларускай культуры; - вызначыць ключавыя этапы і асаблівасці развіцця культуралагічнай думкі Беларусі XIX - пачатку XX стст.;

- на аснове аналізу гісторыка-культурных ведаў распрацаваць методыку ўкаранення сістэмы маральных каштоўнасцей у сучасны культурна-адукацыйны працэс;

- выклікаць цікавасць да далейшага вывучэння разнастайных аспектаў беларускай культуры ў сусветным кантэксце.

Значнасць падрыхтоўкі дапаможніка абумоўліваецца неабходнасцю комплекснага даследавання шляхоў трансляцыі этычных нормаў і прынцыпаў у сучасны культурна-адукацыйны працэс. Праз нацыянальны змест маральных каштоўнасцей адбываецца самаідэнтыфікацыя беларускага народа. Сістэма маральных каштоўнасцей, сфарміраваная ў беларускай культуры на аснове багатай духоўнай спадчыны народа, задае нарматыўную праграму сацыяльных паводзін у грамадстве. Аналіз культуралагічнай думкі Беларусі азначанага перыяду ў рэчышчы аксіялагічнага падыходу паслужыў падставай для аўтарскай распрацоўкі шляхоў укаранення сістэмы маральных каштоўнасцей у сучасны культурна-адукацыйны працэс Рэспублікі Беларусь. На думку аўтараў гэтымі шляхамі выступаюць наступныя напрамкі:

1) музейна-педагагічны - сукупнасць навукова-асветніцкіх мерапрыемстваў, арыентаваных на сацыялізацыю асобы на аснове сінтэзу сістэмы маральных каштоўнасцей і сучасных музейных тэхналогій;

2) культурна-адукацыйны - сістэма адукацыйна-выхаваўчых і культурна-асветніцкіх мер, скіраваная на фарміраванне і развіццё

творчай асобы праз арыентацыю навучальнага працэсу на каштоўнасці нацыянальнай культуры і іх акгуалізацыю;

3) інфармацыйна-асветніцкі - сістэмная праца, скіраваная на папулярызацыю і прапагандаванне здабыткаў нацыянальнай культуры сродкамі масавай інфармацыі, у тым ліку праз спецыялізаваныя выданні.

Кніга складаецца з трох раздзелаў. Першы раздзел раскрывае культураграфію праблемы каштоўнасцей у беларускай культуры другой паловы XIX - пачатку XX стст. Другі раздзел прысвечаны знаёмству з развіццём культуралагічнай думкі Беларусі ў кантэксце сярэдне- і ўсходнееўрапейскага рэгіёну. У канцы кожнага раздзела і параграфа прапануюцца заданні для самастойнай працы, таксама тэставыя заданні. Трэці раздзел дэманструе магчымасці і сродкі ўвядзення маральных каштоўнасцей у сучасны педагагічны працэс. Гэты раздзел складаецца з трох частак згодна з распрацаванымі аўтарамі напрамкамі (музейна-педагагічны, культурна-адукацыйны, інфармацыйна-асветніцкі). У адпаведнасці са зместам кожнага напрамка аўтарамі прадстаўлены матэрыялы ў разнастайных жанрах. Гэта - культуралагічнае партфоліа персаналій беларускай культуры другой паловы XIX - пачатку XX стст., інтэрв'ю з вядомымі дзеячамі культуры Беларусі, праграмы этнакультурных святаў, артыкулы, віктарыны і сцэнарыі разнастайных культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў.